1-08

ISSN 1993-1999

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС



1 2008

1 (102)
студзень

Выдаецца
са студзеня 1993 г.

# БЕЛАРУСКІ ГІСТАРЫЧНЫ ЧАСОПІС

*Пасведчанне
аб рэгістрацыі
№ 411 ад
28 чэрвеня 1996 г.*

Выходзіць 12 разоў
у год (з ліпеня 2003 г.)

НАВУКОВЫ, НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫ ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСОПІС

**Заснавальнікі:**

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь,
Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі,
Беларускі дзяржаўны універсітэт, Беларускае таварыства «Веды»

*Рэдакцыйная калегія:*

*Галоўны рэдактар Васіль Кушнер*

Сымон Барыс (рэдактар аддзела), Канстанцін Бандарэнка, Пётр Брыгадзін, Рыгор Васілевіч, Максім Гальпяровіч (намеснік галоўнага рэдактара), Анатоль Грыцкевіч, Мікалай Забаўскі, Віктар Іўчанкаў, Аляксандр Каваленя, Міхаіл Касцюк, Уладзімір Клюня, Веньямін Космач, Уладзімір Кошалеў, Надзея Кушнер (рэдактар аддзела), Уладзімір Ладысеў, Рыгор Лазько, Аляксандр Лакотка, Аляксей Літвін, Анатоль Люты, Барыс Ляпешка, Вольга Ляўко, Ігар Марзалюк, Наталля Матусевіч, Аляксандр Радзькоў, Аркадзь Русецкі, Вячаслаў Селяменеў, Аляксандр Смолік, Васіль Стражаў, Сяргей Ходзін, Мечыслаў Часноўскі, Алег Яноўскі, Эдмунд Ярмусік.

*Рэдакцыйная рада:*

Уладзімір Адамушка, Тамара Анціховіч, Юрый Бохан (старшыня рады), Васіль Бушчык, Марыя Бяспалая, Аляксандр Вабішчэвіч, Ала Галубовіч, Надзея Ганушчанка, Уладзімір Гілеп, Аляксандр Груша, Аляксандр Гужалоўскі, Вячаслаў Даніловіч, Таісія Доўнар, Дзяніс Дук, Ларыса Жэрка, Андрэй Каракін, Аляксандр Каханоўскі, Іван Крэнь, Валерый Марозаў, Святлана Марозава, Леанід Мартынаў, Ян Мілеўскі, Антон Мірановіч, Сяргей Новікаў, Вольга Нячай, Васіль Ракуць, Сяргей Рашэтнікаў, Таццяна Румянцава, Віталь Скалабан, Алег Слука, Мікалай Сташкевіч, Валерый Талкачоў, Уладзімір Тугай, Віктар Фядосік, Анатоль Шаркоў, Захар Шыбека.

## ЗМЕСТ

МАТЭРЫЯЛЫ «КРУГЛАГА СТАЛА»

Расійскія рэвалюцыі 1917 года ў лёсе Беларусі (*Матэрыялы "круглага стала", які адбыўся 19 верасня 2007 г. у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі)* — 3

ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

Алеся Белановіч. Палітыка нацысцкага кіраўніцтва ў дачыненні да цяжарных остарбайтарак і іх немаўлят — 17

Уладзімір Паўлаў. Не зламаныя няволяй: беларусы ў канцлагеры Хамельбург — 24

УСЕАГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ

Аляксандр Філіпаў. Адносіны "халіф — султан" і аднаўленне Абасідскага халіфата ў Егіпце (1252—1264 гг.) — 29

| | | |
|---|---|---|
| Абдула М.Альмаграві | Інтэграцыйныя працэсы ў арабскім свеце і лівійска-беларускае супрацоўніцтва | 35 |
| | ГІСТОРЫЯ КУЛЬТУРЫ | |
| Алена Смірнова | Рэзідэнцыі імператара Карла IV Люксембурга | 42 |
| | МЕТОДЫКА. ВОПЫТ | |
| Лідзія Пляшкевіч | Паўрочны кантроль па гісторыі Беларусі *(VII клас)* | 50 |
| Леанід Ярашэвіч | Праграма падрыхтоўкі вучняў да экзамену па гісторыі Беларусі *(X клас)* | 54 |
| Вячаслаў Лазіцкі | Выкарыстанне электронных і традыцыйных сродкаў навучання пры падрыхтоўцы вучняў да выніковай атэстацыі і цэнтралізаванага тэсціравання па гісторыі Беларусі *(XI (XII') клас)* | 61 |
| | РЭЦЭНЗІІ | |
| Таццяна Валодзіна | Значны поспех беларускіх этнографаў і краязнаўцаў | 69 |
| | З падзей 2007 года | 72 |
| | Юбілейныя даты на 2008 год | 77 |
| | Содержание | 79 |
| | Summary | 80 |


*У адпаведнасці з загадам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі ад 04.07.2005 г. № 101 «Беларускі гістарычны часопіс» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных, палітычных, педагагічных, філасофскіх і юрыдычных навуках, а таксама ў адпаведнасці з загадам ад 05.10.2005 г. № 143 — па мастацтвазнаўстве і культуралогіі.*


***Адрас рэдакцыі: 220072, Мінск, вул. Акадэмічная, 1, пакой 402; 220050, Мінск, вул. Ленінградская, 14, пакой 707. Тэлефоны: (017) 284-27-00, 209-54-63; факс: 284-27-00.***
**http://aiv.by; e-mail: aiv@aiv.by, bhc@aiv.by.**
**РУП «Выдавецтва «Адукацыя і выхаванне».**
Падпісана да друку 11.01.2008 г.
Выхад у свет 25.01.2008 г. Афсетны друк.
Фармат 60x84 $^{1}/_{8}$.
Ум. друк. арк. 9,3. Ул.-выд. арк. 11.
Наклад 1 868 асобнікаў. Зак. 0063.
*Надрукавана ў друкарні РУП «Прамдрук»: Ліцэнзія № 02330/0148775 ад 30.04.2004 г. 220049, г. Мінск, вул. Чарняхоўскага, 3.*


Да ведама аўтараў!

За дакладнасць прыведзеных у артыкулах фактаў і цытат адказнасць нясуць аўтары. Рэдакцыя можа друкаваць матэрыялы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтараў. Навуковыя артыкулы прымаюцца да разгляду з рэкамендацыяй кафедры (аддзела) вучэбнай або навуковай установы. Рэцэнзаванне арганізоўвае рэдакцыя. Да разгляду прымаюцца рукапісы аб'ёмам не больш як 16 старонак (кегель 14, праз 1,5 інтэрвала) у двух экземплярах (пажадана з дыскетай). Неабходна ў допісах паведамляць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, кароткія звесткі пра сябе, пашпартныя даныя (абавязкова асабісты нумар), дакладны адрас, тэлефон. Рукапісы не вяртаюцца.

УВАГА!
Пераносы некаторых слоў, а таксама некаторыя абазначэнні на замежных мовах зроблены не па правілах граматыкі, а з улікам магчымасцей камп'ютэрнай настольна-выдавецкай сістэмы.


© «Беларускі гістарычны часопіс», 2008.



Леанід ЯРАШЭВІЧ

# Праграма падрыхтоўкі вучняў да экзамену па гісторыі Беларусі

*X клас*

*Працэс авалодвання школьнікамі гістарычнымі ведамі і засваення адпаведных уменняў павінен мець сістэмны характар.*

*У падрыхтоўцы вучняў да экзамену па гісторыі Беларусі назапашаны значны вопыт настаўнікамі В.Ракуцем, Т.Волкавай, А.Макеенкавай, В.Лазіцкім, супрацоўнікамі Нацыянальнага інстытута адукацыі. Выдадзены метадычныя рэкамендацыі па вызначэнню ўзроўню падрыхтоўкі вучняў базавай школы. Ёсць таксама сістэма распрацаваных рознаўзроўневых заданняў.*

*Праграмай па гісторыі Беларусі для 10-га класа прадугледжаны 3 вучэбныя гадзіны перадэкзаменацыйнага паўтарэння. Для арганізацыі паўтарэння вывучанага ў 5—10-м класах матэрыялу мэтазгодна выкарыстаць праграму, якая будзе выконваць ролю своеасаблівага арыенціровачнага плана і служыць для сістэматызацыі ведаў вучнямі. Прапануемая мной прыкладная праграма па гісторыі Беларусі за курс базавай школы распрацавана з улікам заўваг і прапаноў настаўнікаў — удзельнікаў эксперыментальнай апрабацыі абноўленага зместу гістарычнай адукацыі пры пераходзе на 12-гадовы тэрмін навучання.*

### Тэма 1. Жыццё і заняткі першабытных людзей на тэрыторыі Беларусі

*Жыхары на тэрыторыі Беларусі ў каменным веку.* Пранікненне першых людзей на тэрыторыю Беларусі. Стаянкі першабытных людзей, асаблівасці іх побыту. Сутнасць спажывецкай гаспадаркі: збіральніцтва, паляванне, рыбная лоўля. Аселы лад жыцця. З'яўленне глінянага посуду. Першабытныя шахцёры. Сацыяльныя супольнасці людзей каменнага веку: першабытны чалавечы статак, мацярынская родавая абшчына.

*Жыхары на тэрыторыі Беларусі ў бронзавым і жалезным вяках.* Прарадзіма славян. Рассяленне на тэрыторыі Беларусі індаеўрапейскіх плямён. Пераход ад спажывецкай да вытворчай гаспадаркі. Віды земляробства. Узнікненне жывёлагадоўлі. Роля металаў у жыцці старажытных людзей. Спосабы здабычы і апрацоўкі жалеза. Удасканаленне прылад працы. Пераход ад мацярынскай да бацькоўскай родавай абшчыны. Спецыялізацыя мужчынскай і жаночай працы. Узнікненне маёмаснай няроўнасці. Узнікненне і роля гарадзішчаў.

*Уяўленні старажытных людзей пра навакольнае асяроддзе.* Сутнасць веры ў звышнатуральныя сілы. Раннія формы рэлігійных вераванняў. Пахавальныя рытуалы.



*ЯРАШЭВІЧ Леанід Аляксандравіч — настаўнік гісторыі пінскай сярэдняй школы № 15. Нарадзіўся ў в. Хатынічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобл. У 1992 г. скончыў гістарычны факультэт Мінскага дзяржаўнага інстытута імя М.Горкага. Настаўнік вышэйшай катэгорыі.*

*Зараджэнне мастацтва і яго сутнасць.* Старажытная скульптура. Арнамент на гліняным посудзе. З'яўленне жаночых упрыгожанняў.

### Тэма 2. Усходнеславянскія плямёны на тэрыторыі Беларусі: рассяленне, грамадскія і гаспадарчыя адносіны ў IX —XII стст.

*Рассяленне ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі.* Славяне і балты. Славянізацыя балцкага насельніцтва. Усходнеславянскія племянныя аб'яднанні: крывічы, дрыгавічы, радзімічы.

*Грамадскія адносіны.* Пераход да суседскай (сельскай) абшчыны. Сяляне-абшчыннікі.

*Гаспадарчыя адносіны.* Даніна і палюддзе. Сутнасць феадальных адносін. Узнікненне гарадоў, іх выгляд і насельніцтва. Рамесная вытворчасць. Гандаль. Шлях "з варагаў у грэкі".

### Тэма 3. Полацкае княства ў IX—XI стст. Княжацка-вечавы лад

*Полацкае княства.* Полацкі князь Рагвалод. Князёўна Рагнеда. Князь Ізяслаў і аднаўленне княжацкай дынастыі. Узаемаадносіны Полацкага і Кіеўскага княстваў: барацьба за волакі. Узвышэнне Полацкага княства. Князь Усяслаў Брачыславіч (Чарадзей). Бітва на Нямізе (1067 г). Падзел Полацкай зямлі ў XII ст. на ўдзельныя княствы-валасці. Часовае ўзвышэнне Мінскага княства. Князь Глеб Менскі.

*Княжацка-вечавы лад у Полацку.* Улада князя. Вайсковая арганізацыя. Дзейнасць веча. Закон і суд. "Руская праўда".

### Тэма 4. Рэлігія і культура на беларускіх землях у X—XIII стст.

*Распаўсюджанне хрысціянства на беларускіх землях.* Пераход ад язычніцтва да хрысціянства: дваявер'е. Жыццё і дзейнасць Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага.

*Мастацтва.* Мураванае дойлідства. Фрэскі. Крыж Ефрасінні Полацкай. Пісьменнасць. Рукапісныя кнігі.

### Тэма 5. Утварэнне Вялікага княства Літоўскага. Умацаванне велікакняжацкай улады ў першай палове XIV ст.

*Утварэнне Вялікага княства Літоўскага.* Сутнасць феадальнай раздробленасці. Гарады і княствы ў Верхнім Панямонні. Пранікненне нямецкіх рыцараў ва Усходнюю Прыбалтыку. Кукенойс і Герцыке — крэпасці Полацкай зямлі. Князь Вячка. Супрацьдзеянне Полацка захопнікам. Якаў Палачанін. Давыд Гарадзенскі — адважны военачальнік. Летапісныя звесткі пра Літву і князя Міндоўга. Каранацыя Міндоўга.

*Умацаванне велікакняжацкай улады.* Шляхі ўваходжання Полацкага, Віцебскага, Тураўскага і іншых княстваў у склад Вялікага княства Літоўскага. Княжанне Гедзіміна. Значэнне пераносу сталіцы дзяржавы ў Вільню (1323 г.). Паходжанне і сутнасць назвы дзяржавы — "Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае".

### Тэма 6. Дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага ў XIV—пачатку XVI ст.

*Унутранае становішча ў Вялікім княстве Літоўскім.* Улада вялікага князя літоўскага як вышэйшай асобы ў краіне. Княжанне Гедзімінавічаў. Барацьба Ягайлы за вялікае княжанне. Полацкі князь Андрэй. Умацаванне велікакняжацкай улады Вітаўта.

*Вышэйшыя органы ўлады.* Кіраванне дзяржавай пры Альгердзе, Ягайле, Вітаўце. Паны-рада як дарадчы орган пры вялікіх князях літоўскіх Казіміру і Аляксандру. Мясцовае кіраванне. Судовая сістэма. Заканадаўства. Статут ВКЛ 1529 г.

### Тэма 7. Знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага ў XIV—пачатку XV ст. Крэўская унія. Грунвальдская бітва

*Умацаванне знешнепалітычнага становішча ВКЛ.* Далучэнне Смаленскай, Бранскай, Кіеўскай зямель да ВКЛ. Перамога Альгерда ў бітве на рацэ Сінія Воды (1362 г.). Паходы Альгерда на Маскву. Пашырэнне Вітаўтам межаў ВКЛ. Вялікае княства Літоўскае — буйнейшая дзяржава ў Еўропе.

*Крэўская унія: прычыны, умовы і наступствы.* Прычыны заключэння Крэўскага пагаднення 1385 г. і яго ўмовы. Абранне Ягайлы польскім каралём. Станоўчыя і адмоўныя вынікі Крэўскай уніі.

*Грунвальдская бітва.* Падрыхтоўка Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага да бітвы з Тэўтонскім ордэнам. Ход бітвы. Вынікі і гістарычнае значэнне Грунвальдскай бітвы (1410 г.).

### Тэма 8. Сельская гаспадарка і становішча гарадоў у Вялікім княстве Літоўскім у XIV—XV стст. Запрыгоньванне сялянства

*Саслоўі ў Вялікім княстве Літоўскім.* Сутнасць падзелу грамадства на саслоўі. Феадалы-ўладальнікі зямлі. Князі, паны, баяры-шляхта. Мяшчане. Сяляне.

*Запрыгоньванне сялянства.* Землеўладанне і землекарыстанне. Прывілей Казіміра 1447 г. Судзебнік Казіміра 1468 г. Павіннасці сялян.

*Развіццё гарадоў.* Крыніцы павелічэння насельніцтва гарадоў. Магдэбургскае права. Рамяство і гандаль.

### Тэма 9. Культура Беларусі ў XIV — XV стст. Паходжанне назвы "Белая Русь"

*Утварэнне беларускай народнасці.* Прыкметы беларускага этнасу. Рысы характару беларусаў. Назвы "русіны", "палешукі", "беларусы". Гіпотэзы паходжання назвы "Белая Русь".

*Духоўная і матэрыяльная культура.* Уплыў рэлігіі на культуру. Царква і касцёл. Дойлідства. Жывапіс і скульптура. Кніжная справа. Беларуска-літоўскія летапісы.

### Тэма 10. Люблінская унія. Становішча Вялікага княства Літоўскага ў складзе Рэчы Паспалітай

*Люблінская унія.* Прычыны аб'яднання ВКЛ з Каралеўствам Польскім. Скліканне супольнага польска-велікакняжацкага сейма ў Любліне. Прыхільнікі і праціўнікі уніі. Далучэнне часткі зямель ВКЛ да Каралеўства Польскага. Сутнасць акта 1 ліпеня 1569 г. аб утварэнні Рэчы Паспалітай.

*Барацьба за захаванне самастойнасці Вялікага княства Літоўскага.* Умовы аб'яднання ВКЛ і Каралеўства Польскага. Стаўленне шляхты ВКЛ да ўмоў Люблінскай уніі. Распрацоўка і прыняцце Статута ВКЛ 1588 г. Спробы захаваць самастойнасць княства. Леў Сапега як дзяржаўны дзеяч.

### Тэма 11. Францыск Скарына — усходнеславянскі і беларускі гуманіст, асветнік, першадрукар

Паходжанне Ф.Скарыны і яго шлях у навуку. Друкарская дзейнасць. Гуманістычныя і патрыятычныя погляды. Ушанаванне памяці Ф.Скарыны.

### Тэма 12. Культура і рэлігійнае жыццё ў Беларусі ў XVI—першай палове XVII ст.

*Адраджэнне ў ВКЛ.* Кнігадрукаванне: Сымон Будны, Васіль Цяпінскі. Асноўныя ідэі "Песні пра зубра" Міколы Гусоўскага. Граматыка Мялеція Сматрыцкага. Сістэма адукацыі: езуіцкія калегіумы, брацкія школы. Будаўніцтва палацава-замкавых комплексаў. Выяўленчае мастацтва: партрэтны жанр і іканапіс. Батлейка.

*Праваслаўе і каталіцызм. Рэфармацыя. Уніяцтва.* Прывілеі касцёлу. Уціск праваслаўнай царквы. Дзеячы Рэфармацыі. Мікалай Радзівіл Чорны. Сутнасць Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г. Іасафат Кунцэвіч і яго дзейнасць.

### Тэма 13. Усталяванне паншчыны і прыгоннага права на беларускіх землях у XVI—XVIII стст. "Валочная памера". Узнікненне мануфактур

*Усталяванне фальваркова-паншчыннай сістэмы ў Вялікім княстве Літоўскім.* Аграрная рэформа Жыгімонта II Аўгуста. "Устава на валокі" 1557 г. Фальварак. Запрыгоньванне сялянства. Феадальныя павіннасці і дзяржаўныя падаткі сялян.

*Узнікненне мануфактур.* Прыкметы мануфактур і іх узнікненне на беларускіх землях. Мастацкія вырабы беларускіх мануфактур.

### Тэма 14. Культура Беларусі ў другой палове XVII—XVIII ст.

*Становішча асветы і навукі.* Георгій Каніскі. Дзейнасць Адукацыйнай камісіі. Казімір Семяновіч. Ілья Капіевіч. Марцін Пачобут-Адляніцкі. Казімір Лышчынскі.

*Беларуска-рускія сувязі.* Беларускія майстры-рамеснікі ў Маскве. Дзейнасць Сімяона Полацкага.

*Мастацтва.* Музыка. Міхал Клеафас Агінскі. Прыгонны тэатр. Міхал Казімір Агінскі. Выяўленчае мастацтва. Палацава-замкавае будаўніцтва.

### Тэма 15. Далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі

*Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай.* Аслабленне цэнтральнай улады. Права ліберум вета. Барацьба магнацкіх груповак. Умяшальніцтва суседніх дзяржаў ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай. Далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі ў час падзелаў Рэчы Паспалітай (1772, 1793, 1795 гг.). Спробы рэформ. Канстытуцыя 3 мая 1791 г.

*Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі 1794 г.* Прычыны, мэты і лозунг паўстання. Тадэвуш Касцюшка. Дзейнасць паўстанцаў у Беларусі. Якуб Ясінскі. Міхал Клеафас Агінскі. Паражэнне і наступствы паўстання 1794 г.

### Тэма 16. Беларусь у вайне 1812 г.

Сітуацыя напярэдадні вайны. Баявыя дзеянні летам 1812 г. Пазіцыя шляхты ў стаўленні да Напалеона. Спроба аднаўлення Вялікага княства Літоўскага. Партызанскі рух. Выгнанне напалеонаўскіх войскаў. Бітва каля вёскі Студзёнкі. Вынікі вайны для Беларусі. Захаванне прыгоннага права.

### Тэма 17. Беларусь у першай палове XIX ст.: грамадска-палітычнае і сацыяльна-эканамічнае становішча

*Грамадска-палітычнае становішча беларускіх зямель.* Мерапрыемствы расійскіх улад пасля падзелаў Рэчы Паспалітай на беларускіх землях. Дзейнасць тайных таварыстваў філаматаў і філарэтаў. Дзекабрысцкі рух на тэрыторыі Беларусі. Адам Чартарыйскі, Іахім Лялевель, Міхал Валовіч, Ігнат Дамейка. Тэадор Нарбут. Шляхецкае паўстанне 1830—1831 гг. на беларускіх землях. "Разбор шляхты". Полацкі царкоўны сабор 1839 г.: ліквідацыя уніяцкай царквы.

*Сацыяльна-эканамічнае становішча насельніцтва беларускіх зямель.* Сялянскія павіннасці. Рэформа Паўла Кісялёва. Паступовы перавод дзяржаўных сялян з паншчыны на чынш. Узнікненне першых фабрык. Шляхі зносін. Роля кірмашоў. Увядзенне мяжы яўрэйскай аселасці.

### Тэма 18. Разлажэнне феадальнага ладу і адмена прыгоннага права ў Беларусі

*Становішча сельскай гаспадаркі.* Землеўладанне і гаспадарка памешчыкаў. Сутнасць крызісу паншчыннай гаспадаркі. Павіннасці прыгонных сялян і іх становішча. Заняпад сялянскай гаспадаркі.

*Рэформа 1861 г.* Маніфест і Палажэнні 19 лютага 1861 г. Асаблівасці адмены прыгоннага права ў беларускіх губернях з абшчыннай і падворнай формамі землекарыстання. Правілы выкупной аперацыі зямлі. Уплыў паўстання 1863 г. на скасаванне часоваабавязанага становішча беларускага сялянства. Абмежаванасць сялянскай рэформы.

### Тэма 19. Паўстанне 1863—1864 гг. у Беларусі. Погляды і дзейнасць К.Каліноўскага

*Прычыны і характар паўстання.* "Белыя" і

"чырвоныя". Рэвалюцыйна-дэмакратычная праграма К.Каліноўскага. Ідэі К.Каліноўскага аб сялянскай рэвалюцыі і народнай дзяржаве. Выданне "Мужыцкай праўды". "Пісьмы з-пад шыбеніцы". Вынікі і наступствы паўстання.

### Тэма 20. Культура Беларусі ў XIX ст.

*Адукацыя і навука.* Змены ў сістэме адукацыі. Полацкая езуіцкая акадэмія. Віленскі універсітэт. Горы-Горацкі земляробчы інстытут. Пачаткі беларусазнаўства. Развіццё навуковых ведаў пра Беларусь і беларускі народ. Ян Чачот. Канстанцін і Яўстафій Тышкевічы. Адам Кіркор. "Заходнерусізм".

*Літаратура і мастацтва.* Станаўленне нацыянальнай мовы і літаратуры. Янка Лучына, Адам Міцкевіч, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Паўлюк Багрым. Дзейнасць Івана Насовіча. Творчасць Францішка Багушэвіча. Жывапіс (Валенцій Ваньковіч, Іван Хруцкі, Напалеон Орда, Нікадзім Сілівановіч). Тэатр і музыка (Станіслаў Манюшка, Антон Абрамовіч). Архітэктура.

### Тэма 21. Развіццё капіталізму ў Беларусі пасля адмены прыгоннага права. Сталыпінская аграрная рэформа

*Сутнасць капіталістычных адносін.* Буржуазныя рэформы 1860—1870-х гг. і асаблівасці іх правядзення ў Беларусі.

*Прамысловасць. Гарады.* Станаўленне фабрычнай (машыннай) вытворчасці. Спецыялізацыя прамысловасці. Асаблівасці прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі. Рост гарадоў. Змены ў сацыяльным складзе гарадскога насельніцтва.

*Гандаль. Фінансы. Транспарт.* Развіццё гандлю. Пашырэнне ўнутранага рынку. Уплыў на гаспадарку Беларусі агульнарасійскага і еўрапейскага рынкаў. Станаўленне банкаўскай сістэмы. Пранікненне замежнага капіталу ў эканоміку Беларусі. Шляхі зносін і сродкі сувязі. Будаўніцтва чыгунак.

*Сталыпінская аграрная рэформа.* Пётр Сталыпін. Прычыны правядзення аграрнай рэформы, яе эканамічныя і палітычныя мэты. Разбурэнне сялянскай абшчыны. Палітыка хутарызацыі. Арганізацыя перасялення сялян у азіяцкую частку Расіі. Вынікі і значэнне рэформы для Беларусі.

### Тэма 22. Фарміраванне беларускай нацыі. Развіццё культуры Беларусі ў пачатку XX ст.

*Умовы і асаблівасці ўтварэння беларускай нацыі.* Тэрыторыя і насельніцтва Беларусі. Агульнасць гаспадарчага жыцця насельніцтва Беларусі, асаблівасці канфесіянальнага і саслоўнага складу. Развіццё беларускай літаратурнай мовы. Этнічная самасвядомасць.

*Нацыянальна-культурнае Адраджэнне.* Газета "Наша доля". Роля "Нашай нівы" ў развіцці культуры Беларусі і аб'яднанні нацыянальнай інтэлігенцыі. Сутнасць беларускай нацыянальнай ідэі.

*Адукацыя і навука.* Становішча пачатковай, сярэдняй, вышэйшай адукацыі. Навуковыя даследаванні аб гісторыі Беларусі, мове, этнаграфіі беларусаў. Яўхім Карскі, Мітрафан Доўнар-Запольскі, Вацлаў Ластоўскі.

*Літаратура. Тэатр.* Развіццё беларускай літаратуры. Творчасць Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Алаізы Пашкевіч (Цёткі). Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Ігнат Буйніцкі.

### Тэма 23. Рэвалюцыя 1905—1907 гг. і Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. як этапы на шляху буржуазна-дэмакратычнага рэфармавання Беларусі

*Рэвалюцыя 1905—1907 гг.* Прычыны рэвалюцыі. Асноўныя падзеі і вынікі рэвалюцыі. Узнікненне і дзейнасць палітычных партый і рухаў. Праграмныя патрабаванні Беларускай сацыялістычнай грамады. Беларускі нацыянальны рух. Дзейнасць дэпутатаў ад Беларусі ў Дзяржаўнай думе.

*Лютаўская рэвалюцыя 1917 г.* Прычыны рэвалюцыі. Сутнасць крызісу самадзяржаўя. Фарміраванне Саветаў і буржуазных органаў улады. Двоеўладдзе ў войску. Вынікі Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Падабенства і адрозненне рэвалюцыі 1905—1907 гг. і Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г.

### Тэма 24. Беларусь у гады Першай сусветнай вайны

*Першая сусветная вайна.* Прычыны і характар вайны. Ваенныя дзеянні. Бежанства. Акупацыя заходняй часткі Беларусі. Становішча насельніцтва Беларусі. Акупацыйная палітыка германскіх улад — палітыка бізуна і перніка.

*Сітуацыя ў Цэнтральнай і Усходняй Беларусі.* Ваенныя павіннасці насельніцтва. Заняпад сельскай гаспадаркі. Мілітарызацыя прамысловасці. Становішча насельніцтва і бежанцаў. Развіццё беларускага нацыянальнага руху.

### Тэма 25. Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. у Беларусі

*Кастрычніцкае ўзброенае паўстанне ў Петраградзе.* Усталяванне Савецкай улады ў Мінску. Стварэнне Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) Заходняй вобласці і фронту. Ліквідацыя "Камітэта выратавання рэвалюцыі". Ліквідацыя Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ў Магілёве. Пераход улады ў рукі Саветаў у Беларусі і на Заходнім фронце. Фарміраванне і дзейнасць Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту (Аблвыкамзаха). А.Ф.Мяснікоў.

### Тэма 26. Беларускі нацыянальны рух восенню 1917 г.—вясной 1918 г. Савецка-польская вайна ( 1919—1920 гг.)

*Беларускі нацыянальны рух.* Усебеларускі з'езд у снежні 1917 г., яго рашэнні і роспуск. "Устаўныя граматы" Выканкама Усебеларускага з'езда. Падпісанне Брэсцкага міру. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), стварэнне і дзейнасць яе ўрада. Дзеячы БНР: Антон Луцкевіч, Аркадзь Смоліч, Вацлаў Ластоўскі.

*Утварэнне ССРБ.* Пазіцыя Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту па белару-

скім пытанні. Роля Беларускага нацыянальнага камісарыята (Белнацкама) і беларускіх секцый РКП (б) у вырашэнні пытання аб беларускай дзяржаўнасці. Аляксандр Чарвякоў, Зміцер Жылуновіч. І з'езд Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі 1 студзеня 1919 г. Першы Усебеларускі з'езд Саветаў і яго рашэнні. Канстытуцыя ССРБ 1919 г. Утварэнне Літоўска-Беларускай ССР. Далучэнне Віцебскай і Магілёўскай губерняў да РСФСР. Палітыка "ваеннага камунізму".

*Савецка-польская вайна 1919—1920 гг.* Прычыны вайны і польская акупацыя. Беларускі партызанскі рух.

*Другое абвяшчэнне ССРБ.* Вызваленне Мінска войскамі Чырвонай Арміі ад польскіх акупантаў. Дэкларацыя аб незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі 31 ліпеня 1920 г. Рыжскі мірны дагавор (18 сакавіка 1921 г.) і яго вынікі для Беларусі. Версальска-Вашынгтонская сістэма.

### Тэма 27. Савецкая Беларусь у гады новай эканамічнай палітыкі. Удзел БССР ва ўтварэнні СССР

*Увядзенне новай эканамічнай палітыкі.* Становішча Беларусі пасля Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Аднаўленне народнай гаспадаркі. Адмова ад палітыкі "ваеннага камунізму" і замена харчразвёрсткі натуральным падаткам. Увядзенне іншых элементаў нэпа і іх уплыў на ўздым сельскай гаспадаркі. Роля каапераціі.

*Грамадска-палітычнае жыццё.* Усталяванне ў БССР аднапартыйнай сістэмы. Роля КП(б)Б у грамадска-палітычным жыцці БССР. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва: удзел БССР ва ўтварэнні Саюза ССР 30 снежня 1922 г., узбуйненне БССР 1924 і 1926 гг. Статус БССР у складзе СССР. Канстытуцыя Беларускай ССР 1927 г.

### Тэма 28. Індустрыялізацыя і калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР: прычыны, метады правядзення, асаблівасці і вынікі

*Індустрыялізацыя ў БССР.* Неабходнасць і сутнасць індустрыялізацыі. Пераход да адміністратыўна-каманднай сістэмы кіравання эканомікай. Усталяванне адзінай дзяржаўнай уласнасці на сродкі вытворчасці. Асаблівасці індустрыяльнага развіцця БССР у гады першых пяцігодак. Формы працоўнай актыўнасці насельніцтва.

*Калектывізацыя сельскай гаспадаркі.* Узаемасувязь індустрыялізацыі і пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы. Стварэнне калгасаў, формы і метады рэарганізацыі сельскай гаспадаркі ў 1920—1930-я гг. Метады і тэмпы правядзення калектывізацыі. Погляды Дзмітрыя Прышчэпава на шляхі арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Стварэнне машынна-трактарных станцый. "Дваццаціпяцітысячнікі". Палітыка раскулачвання. Вынікі і наступствы калектывізацыі.

### Тэма 29. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё БССР у 1920—1930-я гг.

*Грамадска-палітычнае жыццё.* Сутнасць і асноўныя рысы савецкай грамадска-палітычнай сістэмы. Кіруючая роля Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Органы дзяржаўнай улады і кіравання. Грамадскія арганізацыі. Усталяванне сталінскага палітычнага рэжыму. Палітычныя рэпрэсіі. Справа "Саюза вызвалення Беларусі". Канстытуцыя БССР 1937 г.

*Палітыка беларусізацыі.* Сутнасць і кірункі палітыкі беларусізацыі. Пашырэнне сферы ўжывання беларускай мовы. Карэнізацыя. Згортванне беларусізацыі. Барацьба з "нацдэмамі".

*Адукацыя і навука.* Сутнасць культурнай рэвалюцыі. Меры па ліквідацыі непісьменнасці. Станаўленне савецкай сістэмы адукацыі ў БССР. Рэарганізацыя Інстытута беларускай культуры ў Беларускую Акадэмію навук. Усевалад Ігнатоўскі. Даследаванні Аляксандра Чыжэўскага, Ота Шміта.

*Літаратура і мастацтва.* Асноўныя тэмы ў творчасці беларускіх пісьменнікаў. Янка Купала, Якуб Колас. Развіццё беларускага тэатра (рэжысёры Яўген Міровіч, Уладзіслаў Галубок). Станаўленне кінамастацтва (Юрый Тарыч, Уладзімір Корш-Саблін). Музычнае мастацтва (кампазітары Анатоль Багатыроў, Яўген Цікоцкі). Выяўленчае мастацтва (мастакі Валянцін Волкаў, Яўген Зайцаў, Міхаіл Філіповіч). Архітэктура (Іосіф Лангбард). Скульптура (Заір Азгур).

### Тэма 30. Становішча Заходняй Беларусі ў 1920—1930-я гг. Уз'яднанне беларускага народа ў складзе БССР

*Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы.* Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі. Структура прамысловасці. Насаджэнне асадніцтва. Матэрыяльнае становішча працоўных. Забастовачная барацьба.

*Палітычны рэжым II Рэчы Паспалітай.* Партызанскі рух у першыя гады польскага панавання. Беларускія нацыянальныя партыі і арганізацыі. Юзаф Пілсудскі. Санацыя. Дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ) і яе роспуск. Сяргей Прытыцкі. Беларуская сялянска-работніцкая грамада (БСРГ). Браніслаў Тарашкевіч. Дзейнасць беларускіх паслоў у польскім сейме. Рэпрэсіі супраць палітычных дзеячаў Заходняй Беларусі ў СССР і БССР.

*Становішча культуры ў Заходняй Беларусі.* Дзейнасць Таварыства беларускай школы (ТБШ). Развіццё літаратуры (Максім Танк, Піліп Пестрак). Выяўленчае мастацтва (Язэп Драздовіч, Пётр Сергіевіч). Музыка (Рыгор Шырма).

*Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.* Савецка-германскі дагавор аб ненападзенні і яго супярэчнасці. Агрэсія фашысцкай Германіі супраць Польшчы. Устанаўленне Савецкай улады ў Заходняй Беларусі. Народны сход і яго рашэнні. Прыняцце Заходняй Беларусі ў склад СССР і БССР.

### Тэма 31. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі. Устанаўленне нацысцкага акупацыйнага рэжыму

*Пачатак Другой сусветнай вайны.* Сутнасць

фашызму і нацызму. "Дзіўная вайна". Вераломнае нападзенне фашысцкай Германіі на СССР. Гераічная абарона Брэсцкай крэпасці. Прычыны адступлення войскаў Чырвонай Арміі на першым этапе вайны. Народнае апалчэнне. Баі пад Мінскам, Оршай, Магілёвам, Гомелем і іх вынікі.

*Акупацыя Беларусі.* Мэты акупацыйнай палітыкі. Сутнасць і рэалізацыя плана "Ост". Карныя экспедыцыі. Генацыд. Канцэнтрацыйныя лагеры і турмы. Гета. Халакост. Прымусовы вываз мірнага насельніцтва на катаржныя работу ў Германію.

### Тэма 32. Усенародная барацьба супраць акупантаў

*Арганізацыя барацьбы супраць фашысцкіх захопнікаў у Беларусі.* Першыя партызанскія атрады і падпольныя арганізацыі. Васіль Корж, Мінай Шмыроў, Ціхан Бумажкоў, Канстанцін Заслонаў. Перамога ў бітве пад Масквой і яе роля ў разгортванні народнага супраціўлення. Дзейнасць КП(б)Б па арганізацыі барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Развіццё падпольнага руху. Барацьба з акупантамі ў Мінску, Магілёве, Віцебску. Дыверсійная работа на чыгуначным вузле Орша. Супраціўленне ў гета.

*Баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў.* Стварэнне Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху (ЦШПР і БШПР). Панцялей Панамарэнка, Пётр Калінін. Партызанскія зоны. Дапамога мясцовага насельніцтва і савецкага тылу партызанам і падпольшчыкам. Іван Кавалёў, Васіль Казлоў, Кірыла Мазураў, Пётр Машэраў, Вера Харужая. Подзвіг братоў Міхаіла і Івана Цубаў. Сталінградская і Курская бітвы і іх уплыў на пашырэнне руху Супраціўлення. "Рэйкавая вайна". Характар дзейнасці польскай Арміі Краёвай. Інтэрнацыянальны характар барацьбы з фашысцкімі захопнікамі.

### Тэма 33. Вызваленне БССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

*Пачатак вызвалення Беларусі.* Дапамога партызан і мясцовага насельніцтва Чырвонай Арміі. Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён". Акружэнне і разгром фашысцкіх груповак пад Віцебскам, Бабруйскам, Мінскам. Вызваленне Мінска. Подзвігі савецкіх воінаў. Уклад прадстаўнікоў беларускага народа ў Перамогу над фашызмам на франтах Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ушанаванне памяці воінаў, партызан і падпольшчыкаў.

### Тэма 34. БССР у другой палове 1940-х—першай палове 1950-х гг. Удзел БССР у заснаванні ААН

*Пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі.* Страты Беларусі падчас фашысцкай акупацыі. Аднаўленне і развіццё эканомікі БССР у першую пасляваенную пяцігодку. Асаблівасці развіцця прамысловасці Беларусі. Становішча ў сельскай гаспадарцы. Працоўны энтузіязм. Ажыццяўленне калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі.

*Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі.* Захаванне таталітарнага палітычнага рэжыму ў Беларусі. Месца і роля Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі, Саветаў, грамадскіх арганізацый у савецкай грамадска-палітычнай сістэме. Панцеляймон Панамарэнка, Васіль Казлоў.

*Удзел БССР у заснаванні ААН.* Савецкая стратэгія ў адносінах да ААН. Уключэнне БССР у склад краін-заснавальніц ААН. Удзел урадавай дэлегацыі БССР у распрацоўцы Статута ААН. Андрэй Грамыка.

### Тэма 35. БССР у другой палове 1950—першай палове 1960-х гг.: грамадска-палітычнае жыццё і развіццё народнай гаспадаркі

*Спробы дэмакратызацыі грамадскага жыцця.* Асуджэнне культу асобы. Умацаванне кіруючай ролі Камуністычнай партыі Беларусі. Кірыла Мазураў. Павышэнне ролі Саветаў і грамадскіх арганізацый.

*Сацыяльна-эканамічнае развіццё.* Хуткае развіццё машынабудавання і металаапрацоўкі. Будаўніцтва прадпрыемстваў хімічнай і нафтаперапрацоўчай прамысловасці. Фарміраванне прамысловага комплексу Беларусі ў складзе СССР. Вынікі развіцця сельскай гаспадаркі рэспублікі. Кірыла Арлоўскі. Паступовае паляпшэнне ўмоў жыцця насельніцтва.

### Тэма 36. БССР у другой палове 1960—першай палове 1980-х гг.: грамадска-палітычнае жыццё і сацыяльна-эканамічнае развіццё

*Грамадска-палітычнае жыццё.* Курс на пабудову камуністычнага грамадства. Заканадаўчае замацаванне кіруючай ролі Камуністычнай партыі ў Канстытуцыях СССР і БССР. Пётр Машэраў. Рост грамадскай актыўнасці насельніцтва Беларусі. Згортванне сфер выкарыстання беларускай мовы.

*Эканамічная рэформа 1965 г. і яе вынікі.* Асноўныя прынцыпы эканамічнай рэформы 1965 г. Увядзенне гаспадарчага разліку на прадпрыемствах. Захаванне асноўных прынцыпаў адміністратыўна-каманднай сістэмы кіравання эканомікай. Сельская гаспадарка: меліярацыя і хімізацыя, будаўніцтва жывёлагадоўчых комплексаў. Зніжэнне тэмпаў прыросту нацыянальнага даходу ў першай палове 1980-х гг. Паглыбленне крызісу ва ўсіх сферах жыцця грамадства.

### Тэма 37. Беларусь у другой палове 1980-х гг.: змены ў эканамічным і грамадска-палітычным становішчы

*Эканамічнае становішча Беларусі.* Аслабленне цэнтралізаванага кіравання. Падзенне тэмпаў росту прамысловай прадукцыі. Перавод прадпрыемстваў на самафінансаванне і гасразлік. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС і яе ўплыў на становішча эканомікі Беларусі і яе экалогіі. Пагаршэнне становішча ў сельскай гаспадарцы. Падзенне ўзроўню жыцця насельніцтва.

*Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця.* Пашырэнне ў краіне прынцыпаў дэмакратыі. Пазбаўленне партыйных органаў дзяржаўных функцый і пашырэнне ўлады Саветаў. Ажыццяў-

ленне прынцыпу парламентарызму ў сістэме заканадаўчай улады: выбары народных дэпутатаў у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы на альтэрнатыўнай аснове. Утварэнне грамадскіх рухаў і фарміраванне шматпартыйнасці ў Беларусі.

**Тэма 38. Развіццё беларускай адукацыі, навукі і культуры ў другой палове 1940-х—1980-я гг.**

*Адукацыя і навука.* Пераход да ўсеагульнай сярэдняй адукацыі моладзі. Пашырэнне сістэмы прафесійна-тэхнічнага навучання. Вышэйшая адукацыя ў Беларусі. Навуковыя дасягненні беларускіх вучоных. Міхаіл Мацапура, Мікалай Барысевіч, Таццяна Бірыч. Лётчыкі-касманаўты Пётр Клімук, Уладзімір Кавалёнак.

*Літаратура і мастацтва.* Станоўчыя бакі і недахопы прынцыпу партыйнасці і метаду сацыялістычнага рэалізму ў літаратуры і мастацтве. Тэма Вялікай Айчыннай вайны і патрыятызму ў беларускай літаратуры (Міхась Лынькоў, Іван Мележ, Іван Навуменка, Іван Шамякін, Васіль Быкаў, Алесь Адамовіч, Янка Брыль). Асвятленне мірнага жыцця ў пасляваенныя гады. Творчасць Якуба Коласа, Петруся Броўкі, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова. Адлюстраванне гістарычных падзей у літаратурнай творчасці Уладзіміра Караткевіча. Праблемы духоўнага жыцця грамадства і іх асвятленне ў беларускім тэатральным і выяўленчым мастацтве. Міхаіл Савіцкі, Віктар Тураў, Уладзімір Мулявін, Сяргей Селіханаў, Анатоль Анікейчык, Леанід Шчамялёў, Май Данцыг, Уладзімір Басалыга.

**Тэма 39. Утварэнне і станаўленне суверэннай Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь**

*Набыццё суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.* Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 27 ліпеня 1990 г. Усесаюзны рэферэндум аб захаванні СССР і яго вынікі. Закон Вярхоўнага Савета БССР "Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР" ад 25 жніўня 1991г. Прыняцце 19 верасня 1991 г. назвы "Рэспубліка Беларусь" і новых дзяржаўных сімвалаў. Белавежскае пагадненне 8 снежня 1991 г. і стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Страта Камуністычнай партыяй манаполіі на ўладу. Развіццё шматпартыйнасці. Усенародны рэферэндум 1995 г. і яго вынікі.

*Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.* Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 г. Рэспубліканскі рэферэндум 24 лістапада 1996 г. і прыняцце новай рэдакцыі Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі). Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка. Рэферэндум 2004 г. Заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлады ў Рэспубліцы Беларусь. Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава.

**Тэма 40. Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 1990-я гг.—пачатку XXI ст.**

Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця краіны. Метады і сродкі яе рэалізацыі. Прыняцце на Першым, Другім, Трэцім усебеларускіх народных сходах асноўных напрамкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 1996—2000, 2001—2005, 2006—2010 гг. Інавацыйная мадэль развіцця Рэспублікі Беларусь.

**Тэма 41. Міжнародныя адносіны Рэспублікі Беларусь. Саюз Беларусі і Расіі**

Пацвярджэнне прыхільнасці Рэспублікі Беларусь прынцыпам Статута ААН і ўдзел у рэфармаванні ААН. Рэспубліка Беларусь — бяз'ядзерная і нейтральная дзяржава. Роля Беларусі ва ўмацаванні Руху недалучэння. Шматвектарнасць знешнепалітычнага курсу. Умацаванне сувязей з краінамі СНД і Прыбалтыйскімі дзяржавамі. Паглыбленне інтэграцыйных працэсаў паміж Беларуссю і Расіяй. Удзел Беларусі ў стварэнні Еўразійскай эканамічнай супольнасці. Узаемаадносіны з Арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Удзел Беларусі ў праграме НАТО "Партнёрства дзеля міру".

**Тэма 42. Дасягненні Рэспублікі Беларусь у развіцці навукі і культуры**

*Дасягненні беларускай навукі.* Роля навукі ў станаўленні інфармацыйнага грамадства. Парк высокіх тэхналогій. Беларуска-расійскае супрацоўніцтва ў касмічнай галіне. Першы з'езд вучоных Беларусі. Жарэс Алфёраў.

*Удасканаленне сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь.* Пераход агульнаадукацыйнай школы на 12-гадовы тэрмін навучання. Прафілізацыя навучання. Пераход на двухступеньчатую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і магістраў.

*Нацыянальна-культурнае развіццё.* Праблемы ў развіцці беларускай мовы, звужэнне сферы яе выкарыстання. Асэнсаванне дзеячамі культуры тэм, звязаных з гістарычным мінулым беларускага народа. Беларускія пісьменнікі пра Чарнобыльскую трагедыю. Роля беларускага мастацтва ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці і ў духоўным узбагачэнні чалавека. Ігар Лучанок.

**Літаратура**

Волкава Т. Рыхтуемся да экзамену з верасня // Беларускі гістарычны часопіс. 2004, № 8. С. 63—65; Гісторыя Беларусі. Матэрыялы для падрыхтоўкі да экзамену. 9-ы клас / Н.М.Ганушчанка, С.В.Паноў, В.У.Ракуць інш. Мн., 2004; Лазіцкі В.Л., Ярашэвіч Л.А. Гісторыя Беларусі. Тэматычныя тэсты для падрыхтоўкі да экзамену (за курс базавай школы) Мн., 2006; Максенкава А. Праграма для падрыхтоўкі да экзамену // Беларускі гістарычны часопіс. 2004, № 8. С. 66—74; Паноў С.В., Ганушчанка Н.М. Гісторыя Беларусі: рознаўзроўневыя заданні для падрыхтоўкі да экзамену (базавая школа). Мн., 2006; Ракуць В. Экзамен па гісторыі Беларусі (Выкарыстанне 10-бальнай сістэмы ацэнкі вучэбна-пазнавальных дасягненняў вучняў) // Беларускі гістарычны часопіс. 2004, № 4. С. 61—64.